**12 верасня – 130** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА ДЗЯНІСАВІЧА СЕВАСЦЬЯНАВА** (1885, Кобрын – 1956), ваеннага дзеяча, генерал-маёра юстыцыі, удзельніка Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў

**Севасцьянаў** Уладзімір Дзянісавіч [31.8 (12.09). 1885 г., Кобрын – 21.05.1956 г.], удзельнік грамадзянскай вайны, генерал-маёр юстыцыі (1943). З служачых.

Член КПСС з 1919 г. У Чырвонай Арміі - з жніўня 1918 г. Удзельнік баёў на Паўднёвым фронце, супраць бандаў Мамантава і Махно.

З 1937 г. У. Севасцьянаў - намеснік старшыні ваеннага трыбунала Прыволжскай ваеннай акругі, потым арміі.

У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. У. Севасцьянаў – старшыня ваеннага трыбунала Асобнай арміі і Ціхаакіянскага флоту.

Пасля вайны У. Дз. Севасцьянаў - старшыня ваеннага трыбунала Ціхаакіянскага флоту і Ваенна-марскога гарнізона Ленінграда. З 1950 г. - у адстаўцы.

У. Дз. Севасцьянаў узнагароджаны ордэнам Леніна, 4 іншымі ордэнамі, медалямі.

*Матэрыял падрыхтаваны ў 2015 г. Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай. Курачук Святлана Дзмітрыеўна, галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі*

**Долготович, Б. Д.** Севастьянов Владимир Дионисович / Б. Д. Долготович // Военачальники земли белорусской : энциклопедический справочник / Б. Д. Долготович. – Минск : БелЭн, 2005. – С. 105.

**Севасцьянаў** Уладзімір Дзянісавіч // Беларуская савецкая энцыклапедыя: у 12 т. / рэдкал.: П. У. Броўка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Галоўная рэдакцыя БСЭ, 1973. – Т. 9. – С. 462.

**Севасцьянаў** Уладзімір Дзянісавіч : з “Дат беларускага календара” / скл.-рэд. Н. І. Барсукова // Новыя кнігі : па старонках беларускага друку. – 2014. – № 9. - С. 12. - У. Д. Севасцьянаў (1885, г. Кобрын – 1956), ваенны дзеяч, генерал-маёр юстыцыі, удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў – 130 гадоў з дня нараджэння.